# ПЕРСПЕКТЫВЫ АРХІЎНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ ПА ГІСТОРЫІ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ (1920–1940-я гг.)

***А. М. Запартыка[1], Л. І. Масейчук[2]***

[1] *Установа "Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі", вул. Кірыла і Мефодія, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, zapartyka@tut. by*

[2] *Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, прасп. Дзяржынскага, 83, г. Мінск, Беларусь, mosejchuk@tut. by*

У артыкуле разглядаюцца перспектывы архіўных даследаванняў, звязаных з перыядам станаўлення, развіцця і функцыянавання вышэйшай адукацыі Беларусі ў 1920–1940-я гг. На прыкладзе аналізу архіўных фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі падаецца шматграннасць і інфарматыўнасць крыніц па дадзенай тэме.

У асобныя групы аўтарамі вылучаюцца дакументы, якія дазваляюць прасачыць станаўленне і развіццё навукова-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі, а таксама матэрыялы, што ўтрымліваюць інфармацыю аб выкарыстанні метадычнага інструментарыя, прымяняемага ў адукацыйнай практыцы вышэйшай школы, і інш. Падрабязна аналізуюцца фонды, якія ўтрымліваюць навукова-тэхнічную дакументацыю. Праца з дадзенай групай дакументаў дазваляе правесці рэканструкцыю развіцця інфраструктуры, неабходнай для паўнавартаснага функцыянавання вышэйшай школы (будаўніцтва вучэбных корпусаў, студэнцкіх інтэрнатаў, сталовых і інш.).

***Ключавыя словы:*** вышэйшая адукацыя; архіў; фонд; дакумент; першакрыніца.

# ПЕРСПЕКТИВЫ АРХИВНЫХ ИССЛЕДОВАНИЙ ПО ИСТОРИИ ВЫСШЕГО ОБРАЗОВАНИЯ БЕЛАРУСИ (1920–1940-е гг.)

***А. М. Запартыко[1], Л. И. Мосейчук[2]***

[1] *Учреждение «Белорусский государственный архив научно- технической документации», ул. Кирилла и Мефодия, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, zapartyka@tut. by*

[2] *Белорусский государственный медицинский университет, просп. Дзержинского 83, 220116, г. Минск, Беларусь, mosejchuk@tut. by*

В статье рассматриваются перспективы архивных исследований, связанных с периодом становления, развития и функционирования высшего образования Беларуси в 1920–1940-е гг. На примере анализа архивных фондов Национального архива Республики Беларусь и Белорусского государственного архива научно-технической документации показывается разноплановость и информативность источников по данной теме.

В отдельные группы авторами выделяются документы, позволяющие проследить становление и развитие научно-методического обеспечения высшего образования, материалы, содержащие информацию об использовании методического инструментария, применяемого в образовательной практике высшей школы, и пр. Подробно анализируются фонды, содержащие научно-техническую документацию. Работа с данной группой документов позволяет провести реконструкцию развития

инфраструктуры, необходимой для полноценного функционирования высшей школы (строительство учебных корпусов, студенческих общежитий, столовых и пр.).

***Ключевые слова:*** высшее образование; архив; фонд; документ; первоисточник.

# PROSPECTS OF ARCHIVAL RESEARCH ON THE HISTORY OF HIGHER EDUCATION IN BELARUS (1920–1940 s)

***A. M. Zapartyka[1], L. I. Maseichuk[2]***

[1] *Institution «Belarusian State Archives scientific and technical documentation «, st. Cyril and Methodius, 4, 220030, Minsk, Belarus, zapartyka@tut. by*

[2] *Belarusian State Medical University, ave. Dzerzhinsky, 83, 220116, Minsk, Belarus, mosejchuk@tut. by*

The article examines the prospects for archival research related to the period of the formation, development and functioning of the higher education in Belarus in the 1920 s – 1940 s. The diversity and informativeness of sources on this topic are shown on the example of the analysis of the archival funds of the National Archives of the Republic of Belarus and the Belarusian State Archive of Scientific and Technical Documentation.

The authors distinguish those documents and materials as separate groups that allow tracing the formation and development of scientific and methodological support of higher education and containing information on the use of methodological tools used in the educational practice of higher education, etc. Funds containing scientific and technical documentation are analyzed in detail. The work with this group of documents makes it possible to reconstruct the development of the infrastructure necessary for the full functioning of a higher school (construction of educational buildings, student dormitories, canteens, etc.).

***Key words:*** higher education; archive; fund; document; original source.

У 20-я гг. XX ст. – складаны час змены сацыяльна-палітычнай мадэлі дзяржавы, краху былых ідэйных і ідэалагічных установак – адбываецца станаўленне і развіццё беларускай вышэйшай адукацыі. Уплыў універсітэта на грамадства, дзяржаву і асобу велізарны: ён фарміруе і пастаянна падсілкоўвае высокаінтэлектуальнае асяроддзе. Адпаведна, і сам універсітэт павялічвае свой патэнцыял за кошт таго, што яго выпускнікі сваёй дзейнасцю і ментальнасцю распаўсюджваюць ідэалы і прагматыку ўніверсітэцкага існавання, яго сутнасць.

Большая частка дакументаў, якія асвятляюць гісторыю станаўлення і развіцця вышэйшай адукацыі Беларусі і якія прадстаўляюць навуковы інтарэс для даследчыкаў, сканцэнтраваны ў фондах Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ) і Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі (далей – БДАНТД).

Найбольш поўныя фонды, якія ўтрымліваюць дакументы па гісторыі станаўлення і развіцця вышэйшай адукацыі Беларусі, захоўваюцца ў

НАРБ. Умоўна іх можна падзяліць на некалькі груп, кожная з якіх мае сваю дакументную спецыфіку.

Заканадаўчая дакументацыя ўтрымліваецца ў Ф. 6 «ЦВК БССР, г. Мінск»; Ф. 15 «Паўнамоцнае прадстаўніцтва Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь пры Урадзе Расійскай Федэрацыі, г. Масква»; Ф. 42 «Міністэрства асветы (Мінасветы) БССР, г. Мінск»; Ф. 44 «Народны камісарыят працы (Наркампрацы) БССР, г. Мінск»; Ф. 101 «Народны камісарыят рабоча-сялянскай інспекцыі (НК РСІ) БССР, г. Мінск»; Ф. 332 «Беларускі рэспубліканскі саюз спажывецкіх таварыстваў (Белкаапсаюз), г. Мінск»; Ф. 701 «Камісія па ажыццяўленні нацыянальнай палітыкі пры Цэнтральным Выканаўчым камітэце (ЦВК) БССР, г. Мінск».

Дакументальныя крыніцы прадстаўлены заканадаўчымі дакументамі, якія наўпрост ці ўскосна характарызуюць палітыку ўраду ў галіне вышэйшай адукацыі ў БССР. Гэта пастановы, якія адносяцца да арганізацыі і адкрыцця Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (далей – БДУ) і іншых вышэйшых навучальных установаў (Ф. 4, воп. 1, адз. зах. 14, 131), дэкрэты, прынятыя на паседжаннях СНК БССР (Ф. 6, воп. 1, адз. зах. 278, 10. Т. 1, 1282; Ф. 15, воп. 1, адз. зах. 26, 28), загады Наркамасветы БССР (Ф. 6, оп. 1, адз. зах. 124, 1282; Ф. 7, воп. 1, адз. зах. 91, 690, 880а; Ф. 15, воп. 1, адз. зах. 2; Ф. 42, воп. 1, адз. зах. 213, 1181; Ф. 93, воп. 1 (Т 2), адз. зах. 7632; Ф. 101, воп. 1, адз. зах. 2889) і пастановы НК РСІ БССР (Ф. 101, воп. 1, адз. зах. 3494, 3557) і інш.

У асобныя калекцыі вылучаны дакументы, якія непасрэдна тычацца канкрэтнай навучальнай установы: Ф. 205 «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт Міністэрства народнай асветы Рэспублікі Беларусь, з 10. 01. 1992 г. – Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, з 23. 09. 1994 г. – Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, з 29. 08. 1996 г. – пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, г. Мінск»; Ф. 209 «Беларускі дзяржаўны інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя Кастрычніцкай рэвалюцыі Наркамзема БССР, г. Мінск»; Ф. 210 «Беларуская дзяржаўная палітэхнічная акадэмія Міністэрства народнай асветы БССР, з 19. 09. 1991 – Міністэрства народнай асветы Рэспублікі Беларусь, з 10. 01. 1992 – Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, з 23. 09. 1994 – Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, з 11. 01. 1997 – Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, г. Мінск»; Ф. 215 «Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» (УА БДЭУ) Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, г. Мінск»; Ф. 218 «Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны медыцынскі інстытут

Міністэрства аховы здароўя БССР, г. Мінск»; Ф. 221 «Мінскі інстытут народнай асветы Наркамасветы БССР, г. Мінск».

Дакументы вышэйназваных фондаў дазваляюць прасачыць станаўленне і развіццё навукова-метадычнага забеспячэння вышэйшай адукацыі ў першыя дзесяцігоддзі дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў. Гэта вучэбна-праграмная дакументацыя, пратаколы паседжанняў рэктарата, вучонага савета, камсамольскіх сходаў, загады ўніверсітэта па агульнай дзейнасці, перапіска з прафесарска-педагагічным складам, асабовыя справы і інш.

Найбольш інфарматыўным відам крыніц пры вывучэнні тэмы «Станаўленне і развіццё вышэйшай адукацыі Беларусі ў 1920–1940-я гг.» з'яўляюцца матэрыялы справаводства. У большасці гэта справаздачы аб працы вышэйшых навучальных устаноў (Ф. 42, воп. 1, адз. зах. 100, 1566; Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 593, 636, 715, 716, 732; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 108), загады і распараджэнні рэктараў і дэканаў (Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 1, 33, 64), перапіска з Наркамхарчам, Савпрафбелам, Галоўпрафадукацыі і Наркамасветы БССР па пытаннях бягучай дзейнасці ўніверсітэта (Ф. 7, воп. 1, адз. зах. 690; Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 21, 179, 237, 487, 538, 548; Ф. 210, воп. 1, адз. зах. 6; Ф. 210, воп. 3, адз. зах. 20; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 228;), пратаколы праўлення ўніверсітэта і пасяджэнняў факультэцкіх саветаў (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 315, 328; Ф. 210, воп. 3, адз. зах. 328; Ф. 218, воп. 1, адз зах. 67; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 19; Ф. 218, воп. 3, адз. зах. 4, 6), планы працы кафедраў (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 482; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 105, 106, 464), інструкцыі па правядзенні практычных заняткаў (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 165, л. 13–14 адв.) і інш.

Для раскрыцця тэмы «Станаўленне і развіццё вышэйшай адукацыі Беларусі ў 1920–1940-я гг.» найбольш інфарматыўнай з'яўляецца група дакументальных крыніц, якія ўтрымліваюць звесткі аб выкарыстанні метадычнага інструментарыя, што прымяняўся ў адукацыйнай практыцы вышэйшай школы (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 15; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 8; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 206; 618), праграмы факультэтаў і тлумачальныя запіскі да іх. 205, воп. 1, адз. зах. 41, 81–85, 87, 231, 281, 282, 381, 483, 484, 730, 752, 764, 786, 803; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 86; Ф. 332, воп. 1, адз. зах. 1308; Ф. 701, воп. 1, адз. зах. 56), гадавыя справаздачы прафесарска-выкладчыцкага складу і факультэтаў (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 82, 86, 89, 129, 177, 795, 796; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 488), справаздачы факультэтаў (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 179, 180, 234, 332, 822; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 108), вучэбныя заданні (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 485) і перапіска

адміністрацыі ўніверсітэта з выкладчыкамі па пытаннях вучэбнай і вучэбна-метадычнай працы (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 824, 892; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 40).

Прааналізаваць дынаміку якасных і колькасных характарыстык студэнтаў і педагогаў вышэйшых навучальных устаноў з 1921 г. да 1941 г., устанавіць наяўнасць і тып сувязяў паміж акадэмічнай паспяховасцю і сацыяльна-дэмаграфічнымі паказчыкамі дазваляюць статыстычныя даныя: справаздачы па прыёму студэнтаў (Ф. 42, воп. 1, адз. зах 213, л. 378–379), каштарысы выдаткаў на абсталяванне кабінетаў і закупку метадычнай і вучэбнай літаратуры (Ф. 42, воп. 1, адз. зах. 1890; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 228; Ф. 218, воп. 3, адз. зах. 3), штатныя расклады (Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 55, 59; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 14), а таксама спісы студэнцкага (Ф. 42, воп. 1, адз. зах. 2098; Ф. 101, воп. 1, адз. зах. 3603; Ф. 44, воп. 1, адз. зах. 472; Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 110, 178, 206; Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 308) і прафесарска-выкладчыцкага складу ВНУ (Ф. 42, воп. 1, адз. зах. 213, адз. зах. 237; Ф. 205, воп. 1, адз. зах. 303, 549, 670, 767; Ф. 218, воп. 1, адз. зах. 32, 520, 623, 635 в.).

Такі від дакументаў, як асабовыя справы прафесарска-выкладчыцкага і студэнцкага складу, носяць змешаны характар. Асабовая справа – гэта справаводная крыніца, якая ўзнікае ў выніку дзейнасці канцылярыі БДУ па прафесарска-выкладчыцкіх і студэнцкіх справах. У той жа час у склад асабовых спраў уваходзяць і дакументы асабістага паходжання: аўтабіяграфіі, заявы, даведкі аб стане здароўя, характарыстыкі, узнагародныя лісты, загады, якія адносяцца да працы педагога ці звязаныя з вучобай студэнта, заявы бытавога характару (аб прадстаўленні жылля, выдзяленні талонаў на харчаванне ці адзенне) і інш. Выкарыстанне дакументаў асабістага характару дазваляе дэталізаваць уяўленне аб праблемах у сферы вышэйшай адукацыі беларускай дзяржавы ў разглядаемы перыяд.

Любая навучальная ўстанова – гэта не толькі людзі, але і будынкі. Рэканструяваць падзеі, звязаныя з прыстасаваннем пад вышэйшыя навучальныя ўстановы старых будынкаў або будаўніцтвам новых вучэбных корпусаў, размяшчэннем сучасных вучэбных аўдыторый дазваляюць дакументы, якія захоўваюцца ў фондах БДАНТД. На жаль, фонды БДАНТД незаслужана мала выкарыстоўваюцца сучаснымі беларускімі вучонымі пры рэканструкцыі падзей, звязаных з развіццём вышэйшай адукацыі Беларусі 1920–1940-х гг. Разам з тым БДАНТД захоўвае дакументы Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь,

якія ўтрымліваюць інфармацыю па гісторыі развіцця навукі, тэхнікі, архітэктуры і культуры, ажыццяўляе іх дзяржаўны ўлік, выкарыстоўвае ў навуковых, народна-гаспадарчых мэтах, арганізоўвае рэстаўрацыю, ажыццяўляе арганізацыйна-метадычнае кіраўніцтва дзейнасцю архіваў устаноў – крыніц камплектавання, якімі з'яўляюцца навукова-даследчыя, праектныя, канструктарска-тэхналагічныя арганізацыі, навукова-вытворчыя аб'яднанні і інш. Акрамя ўсяго, БДАНТД камплектуецца дакументамі асабістага паходжання вядомых прадстаўнікоў навукі, архітэктуры і тэхнікі.

Адным з асноўных відаў дакументаў, якія захоўвае БДАНТД, з'яўляецца праектная дакументацыя, г. зн. узаемазвязаныя праектныя дакументы, якія служаць падставай для будавання, рэканструкцыі, рэстаўрацыі, рамонту, добраўпарадкавання аб'екта і з'яўляюцца падставай для інвестыцый у будаўніцтва ці архітэктурны праект, у праект будаўніцтва ў адпаведнасці з выбранымі заказчыкам, забудоўшчыкам стадыямі праектавання.

Дадзеная дакументацыя ўключае ў тым ліку і дакументы па будаўніцтве, рэканструкцыі, рэстаўрацыі будынкаў вышэйшых навучальных устаноў на тэрыторыі Беларусі.

Так, у фондах Арэнднага прэдрыемства «Інстытут Белдзяжпраект» (Ф. 3, воп. 1, спр. 397–407, 419–425, 426–430, 2666–2678), Дзяржаўнага беларускага праектна-вышукальнага і навукова-даследчага інстытута па праектаванні энергетычных сістэм і электрычных сетак «Белэнэргасецьпраект» (Ф. 8, воп. 1, спр. 492–493, 494–499), Камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Бюро рэгістрацыі і тэхнічнай інвентарызацыі нерухомасці г. Мінска» Галоўнага вытворчага ўпраўлення жыллёвай гападаркі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта (Ф. 15, воп. 1, спр. 241–243), Праектнага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «МІНСПРАЕКТ» Камітэта архітэктуры і будаўніцтва Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта (Ф. 10, воп. 1, спр. 907–913, 914–921), Праектна-канстуктарскага бюро Міністэрства аховы здароў'я БССР (Ф. 14, воп. 1, спр. 12–16), Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «БЕЛНДІТОППРАЕКТ» беларускага канцэрна па паліве і газафікацыі Рэспублікі Беларусь Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь (Ф. 1, воп. 1, спр. 1147–1176) і інш. утрымлівае архітэктурна-будаўнічую дакументацыю па добраўпарадкаванні прылеглых тэрыторый, сістэм жыццезабеспячэння будынкаў галоўнага корпуса, біялагічнага, хімічнага, фізіка-матэматычна і інш. корпусаў, інтэрнатаў БДУ, корпусаў Інстытута

замежных моў у Мінску на скрыжаванні вул. Кірава і Чырвонаармейскай, Інстытута лясной гаспадаркі, Палітэхнічнага, Педагагічнага і Медыцынскага інстытутаў у Мінску.

Уважлівы аналіз дакументаў вышэйпералічаных фондаў дазваляе не толькі ўдакладніць, якія вучэбныя корпусы і будынкі належалі той ці іншай навучальнай установе, але і ўстанавіць наяўнасць вадаправодаў, электрычнасці, як і чым абаграваліся, якія пакоі і аўдыторныя класы там былі, разабрацца, чаму аддадзеныя будынкі пад інтэрнаты не маглі выкарыстоўвацца і інш.

Такім чынам, інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў фондах дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь (НАРБ, БДАНТД і інш.) недастаткова запатрабавана сучаснымі даследчыкамі і ўяўляе сабой перспектыўны кірунак для распрацоўкі тэм, звязаных з вышэйшай адукацыяй Беларусі.